ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 129 (511) Субота, 19 лістапада 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

# За партыю Леніна, за ленінскі Цэнтральны Камітэт!

## ТАК АДКАЗВАЕ КОМСАМОЛ БЕЛАРУСІ НА РАСКОЛЬНІЦКУЮ ПРАЦУ ТРАЦКІСЦКАЙ ОПОЗІЦЫІ.

**Маладыя рабочыя і батракі! Уступайце ў шэрагі Ленінскага Комсамолу!**

## Да ведама організацый УсеКП(б).

XV зьезд УсеКП(б) склікаецца на 1 сьнежня 1927 году ў Маскве.

Парадак дня зьезду: 1. Справаздача ЦК—палітычная і організацыйная. 2. Справаздача Цэнтральнай рэвізійнай камісіі. 3. Справаздача ЦКК-РСІ. 4. Справаздача дэлегацыі УсеКП(б) у ВККІ. 5. Дырэктывы па складаньні 5-гадовага пляну народнае гаспадаркі 6. Аб працы ў вёсцы. 7. Выбары Цэнтр. устаноў партыі.

Норма прадстаўніцтва: 1) адзін дэлегат з рашаючым голасам на 1000 сапраўдных членаў партыі і адзін дэлегат з дарадчым голасам на 2000 кандыдатаў у члены партыі; 2) звыш паказанай колькасьці дарадчыя галасы прадстаўляцца ня будуць.

Сакратар ЦК **В. Молатаў.**

## Рашучы і моцны адпор!

У хуткім часе — 1-га сьнежня— адчыніцца 15-ты зьезд усесаюзнай комуністычнай партыі.

Перад зьездам па пытаньнях абвесткі дню адбываецца дыскусія, якая павінна выявіць адносіны звыш мільёну членаў партыі да ажыцьцяўляемай Ленінскім ЦК УсеКП палітычнай лініі.

**На 17 лістапада ход галасаваньня па дыскусіі малюецца наступнымі лічбамі: — за лінію Цэнтральнага Камітэту галасавала 405.199, супроць 2574 чалавекі.**

**— 405 тысяч 199 чалавек і 2 тысячы 574—вось навочны і аб многім кажучы адказ партыі на антыленінскую, раскольніцкую політыку опозіцыі, накіраваную супроць завет Леніна, супроць асноўных прынцыпаў бальшавізму.**

Комуністычная партыя ў аднагалосна прынятых сотнямі і тысячамі ячэек рэзолюцыях адобрывае і выказвае сваё здавальненьне выключэньнем з партыі галоўных зарваўшыхся важакоў опозіцыі Троцкага і Зіноўева.

У адказ на выключэньне з партыі адзіночак—інтэлігэнтаў, блукаючых у меншавізьме, ня змогшых зразумець і ўцяміць бальшавіцкую лінію, **у партыю ўліваюцца новыя, сьвежыя струмені бальшавіцкай крыві — настрычнікавы заклік рабочых у партыю**

Толькі першыя дні „кастрычнікавага закліку“ далі па СССР **больш 27 тысяч чалавек.** Як нікчэмнай здаецца група політычных сьляпцоў—опозіцыянэраў у параўнаньні з гэтым магутным, з кожным днём узрастаючым папаўненьнем новых бальшавікоў—рабочых, верных сыноў Ленінскай партыі.

* * *

Комсамол Беларусі ўжо шчыльна ўступіў у паласу абгаварваньня тэзісаў дакладаў на 15-м зьездзе ЎсеКП.

Сходы актыву Бабруйску і Мазыру аднагалосна (**прысутнічала 332 чалавекі**) пры 4-х супроць, прынялі рэзолюцыі, поўнасьцю далучаючыся да рашэньняў кастрычнікавага пленуму ЦК УсеЛКСМ.

Гарачая пара абгаварваньня тэзісаў у гарадзкіх ячэйках пачынаецца з сёньнешняга дню.

**Мы цьвёрда пераканаваны, што комсамол Беларусі, усе комсамольскія ячэйкі дадуць рашучы і моцны адпор усякім спробам парушыць адзінства ленінскіх шэрагаў.**

## Прэч раскольнікаў.

**(Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ).**

1. Апошнімі сваімі дзеяньнямі (антыпартыйная і антысавецкая дэмонстрацыя ў час сьвяткаваньня 10-годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі, нелегальныя сходы, дэмонстрацыйны ўход лідэраў опозіцыі з прэзыдыуму ЦКК), опозіцыя парушыла ўсякія рамкі партыйнасьці і партыйнае дысцыпліны, паставіла сябе па-за шэрагамі комуністычнае партыі, фактычна абвесьціла аб організацыі сваей трацкісцкай, па-сутнасьці меншавіцкае партыі, нясумясьцімай з існаваньнем дыктатуры пролетарыяту.

2. У адносінах да лідэраў опозіцыі, партыя праявіла максімум цярплівасьці, зрабіла ўсё магчымае, каб зьвярнуць іх да работы з партыяй і рабочае клясы. На ўсе гэтыя папыткі опозіцыя кожны раз адказвала партыі ўсё больш гнуснымі і наглымі дзеяньнямі і клеветніцкімі нападкамі на партыю і яе ЦК.

3. Бюро ЦК ЛКСМБ лічыць недапусьцімым і нічым не апраўдваемым далейшае прабываньне ў шэрагах УсеКП людзей, ставячых сябе фракцыйнай дзейнасьцю супроць комуністычнае партыі і дыктатуры пролетарыяту фактычна па-за партыяй. Пастанова ЦКК і ЦК УсеКП ад 14 лістапада 1927 г. павінна быць апошнім папярэджаньнем усім тым, хто яшчэ не парваў з опозіцыяй, не зьвярнуўся для шчырай, сумленнай работы з партыяй, хто ня хоча аказацца, няхай нават аб'ектыўна, у шэрагах ворагаў комуністычнае партыі і дыктатуры пролетарыяту.

4. Бюро ЦК ЛКСМБ вітае пастанову ЦКК і ЦК УсеКП аб выключэньні з шэрагаў партыі Троцкага і Зіноўева і выключэньні астатніх лідэраў опозіцыі з складу ЦК і ЦКК, поўнасьцю далучаецца да яе і да пастановы бюро ЦК КПБ па гэтым пытаньні. На вылазкі опозіцыі комсамол адкажа яшчэ большай згуртаванасьцю вакол партыі і яе Ленінскага ЦК, яшчэ большым абхопам сваімі шэрагамі рабочай моладзі, перадачай у шэрагі партыі лепшых комсамольцаў-рабочых.

Няхай жыве адзінства ЎсеКП.

Прэч раскольнікаў, здраднікаў у справе рабочае клясы і Кастрычнікавае рэволюцыі!

## Зіноўеў і Муралаў зьняты з працы.

Савет Народных Камісараў РСФСР пастанавіў: аслабаніць Зіноўева і Муралава ад абавязкаў членаў прэзыдыуму Дзяржпляну РСФСР.

## Усім ячэйкам ЛКСМБ.

У мэтах поўнага і ўсебаковага асьвятленьня ходу прапрацоўкі ў ячэйках КСМ пытаньняў 15-га зьезду ЎсеКП, ЦК ЛКСМБ прапануе ўсім ячэйкам ЛКСМБ, якія працуюць на яўрэйскай мове, а таксама зьмешаным:

1) Даручыць членам ячэйкі, корэспондэнтам газэты „Юнгэр Арбэйтэр“, сыстэматычна дасылаць у рэдакцыю „Юнгэр Арбэйтэр“ поўныя і падрабязговыя корэспондэнцыі аб ходзе абгаварваньня тэзісаў ЦК УсеКП(б).

2) Вылучыць спэцыяльна для гэтай мэты таварышоў у тых ячэйках, дзе корэспондэнтаў „Ю. А.“ няма.

Корэспондэнцыі могуць быць напісаны на любой мове (яўрэйскай, беларускай, расійскай).

У корэспондэнцыях павінны, галоўным чынам, быць высьветлены наступныя моманты:

а) Усе выступленьні комсамольцаў па тым ці іншым пытаньні.

б) Вынікі галасаваньня.

д) Настроі беспартыйнай рабочай моладзі ў сувязі з дыскусіяй.

Сакратар ЦК ЛКСМБ БАРАНЬНІКАЎ.

## Да ўсіх організацый ЛКСМБ.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ просіць дасылаць ей усе матэрыялы аб удзеле комсамольскай організацыі ў партыйнай дыскусіі (лік прысутнічаўшых на сходах ячэек, лік выступаўшых у спрэчках за тэзісы ЦК і супроць іх, вынікі галасаваньня, а таксама прынятыя рэзолюцыі) і ходзе кампаніі па вэрбоўцы рабочай моладзі ў комсамол.

РЭДАКЦЫЯ.

## Комсамол-няпрымірымы вораг трацкізму.

### Аб парадку абгаварваньня тэзісаў да XV зьезду УсеКП(б).

**(Выпіска з пратаколу бюро Менскага Акругкому ЛКСМБ)**

1. Лічыць, што характар і формы ўдзелу комсамолу ў падрыхтоўцы да XV зьезду партыі азначаны пастановай пленуму ЦК УсеЛКСМ у рэзолюцыі „XV зьезд партыі і задачы комсамолу“ і бюро ЦК ЛКСМБ. Выходзячы з гэтых пастаноў, комсамольскія ячэйкі г. Менску і Барысаву абгаварваюць на сваіх сходах тэзісы ЦК УсеКП(б) да XV зьезду партыі; у вясковых ячэйках (у тых выпадках, калі не зьяўляецца магчымым абслужыць паасобку—на групавых сходах ячэек) ставіцца з мэтай растлумачэньня даклад „XV зьезд партыі і задачы комсамолу“ (па рэзолюцыі пленуму ЦК УсеЛКСМ па гэтым пытаньні).

2. Абгаварэньне тэзісаў у комсамольскай організацыі не павінна выліцца ў дыскусію, і ні ў якім выпадку ня можа прыняць характару дыскусіі аб агульнай лініі партыі, яе ЦК і інш. Абгаварэньне павінна датычыцца пытаньняў аб пяцігадовым пляне і працы на вёсцы, бяз прыцягненьня да абгаварваньня ўжо вырашаных пытаньняў партыяй (АРК, Кітай і г. д.).

3. Абгаварваньне пытаньняў зьезду пачаць зараз-жа і скончыць да 1 сьнежня г. г. З гэтай мэтай надыходзячыя саюзныя дні павінны быць цалкам прысьвечаны гэтым пытаньням.

4. Пры клюбе „КІМ“ адчыніць аддзел літаратуры, прысьвечанай гэтым пытаньням. Устанавіць там-жа консультацыю парт.-прапагандыстых.

5. АПА распрацаваць мэтодычныя паказаньні (рэкомэндальны сьпіс літаратуры і г. д.).

Сакратар АК Красоўскі.




Опозіцыянэр: А габэраць, што за намі масы ня ідуць.

## За партыю, за Ленінскі ЦК!

### „Опозіцыянэр“ Тулупаў.

(Мястэчка Смалявічы, Менскай акругі)

На вуліцы цемната...

Ня гледзячы на дрэннае надвор'е, завіруху—вардом поўны.

„Лейся песнь мая“,—заводзіць кучка хлапцоў, якая згуртавалася вакол сцэны.

Усюды гоман, жарты, сьмех.

Сёньня местачковы сход комсамоліі. Будуць абгаварвацца матар'ялы да 15-га зьезду УсеКП(б).

На сцэне сакратар райкому КП(б)Б т. **Пятушкоў**. Ён простымі словамі апавядае сходу аб тэзісах ЦК партыі і адносінах да іх опозіцыі.

У залі цішыня—усе слухаюць уважліва.

Пачынаюцца спрэчкі.

— **Вось**,—кажа комсамолец **Тулупаў**,—**я згодзен з опозіцыяй па пытаньні аб урангелеўскім офіцэры, бо нельга ў ДПУ ўсякую шантрапу браць. А што датычыцца саміх опозіцыянэраў, дык іх ужо даўно трэба было выключыць з партыі.**

У залі падняўся **сьмех і ўзгалосы: О-го-го! І ў нас „опозіцыянэр“ зьявіўся**,—што сьведчыла аб адносінах сходу да тав. Тулупава, які проста **не разумее** сутнасьці ўнутрыпартыйнай барацьбы.

Выступіўшыя потым т. т. **Сагальчык, Ашаровіч і Элькінд** растлумачылі т. Тулупаву няправільнасьць яго погляду і паказалі на неабходнасьць прапрацоўкі таго матар'ялу да 15-га зьезду, які ўжо зараз зьмешчаны ў друку.

У **аднагалосна** прынятай рэзолюцыі сход **адобрыў** тэзісы ЦК, як адзіна ленінскія і адзначыў неабходнасьць узмацненьня політвучобы комсамольцаў.

**Алесь Ліпнёвы.**

## Хто кіруе саюзам?

Опозіцыя прад'явіла комсамолу вельмі сур'ёзнае абвінавачаньне. У сваёй заяве яна зацьвярджае, што кіраўнічыя органы саюзу паступова запаўняюцца дробна-буржуазнымі элемэнтамі.

Але ці права опозіцыя? Ці справядлівы яе цяжкія абвінавачваньні?

Адказ на гэтае пытаньне можна знайсьці ў статыстычных вестках. Лічбы бесстароньнія, і ніхто ня вінен, што яны супроць опозіцыі.

### Возьмем ЦК УсеЛКСМ.

Які яго соцыяльны склад?

Сярод членаў нашага ЦК—65 проц. рабочых, 9 проц. сялян і толькі 25 проц. іншых. Трэба ўлічыць, што ўсе члены нашага ЦК зьяўляюцца членамі партыі. І так, пераважная большасьць у ЦК за рабочымі.

### Што з сябе ўяўляюць нашыя губкомы і ЦК нацрэспублік.

У складзе гэтых кіраўнічых органаў 50 проц. рабочых, 5 проц. батракоў, 26 проц. сялян і толькі 19 проц. іншых. Малюнак прыблізна такі-ж. А калі ўзяць губкомы прамысловых раёнаў, дык у складзе іх мы знойдзем 74 проц. рабочых і толькі 11 проц. іншых.

### А ў акругкомах?

У іх складзе 56 процантаў рабочых, 6 процантаў батракоў, 25 проц. сялян і толькі 13 проц. іншых. 36.000 членаў укомаў і горрайкомаў палова рабочых і толькі 17 проц. іншых.

### У бюро вясковых ячэек

пераважная большасьць за батрацка-бядняцкім ядром (62 про .), а іншых у ім усяго 8 проц. Астатняя маса прыпадае на сялян, сераднякоў і часткова на рабочых.

Дзе-ж дробна-буржуазнае засільле?

### Лічбы б'юць опозіцыю

і на абедзьве лапаткі кладуць яе хлусьлівыя абвінавачаньні.

Навошта патрэбна была гэтая хлусьня?

### Дадзім рашучы адпор.

Думкі опозіцыі вельмі просты і зразумелы.

Опозіцыя хоча адарваць шырокія комсамольскія масы ад іх кіраўнічага асяродку і спіхнуць комсамол з ленінскіх рэек.

Як раз гэтага і дамагаецца опозіцыя. Але не даб'ецца. Комсамольцы ня раз давалі адпор опозіцыі і з ганьбаю адхіляць і гэту вельмі празрыстую хлусьню опозіцыі.

## Аб энтузіязму, гэроізму і романтыцы.

### Хто ў маладосьці ня марыць аб гэроічных учынках?

Хто з юнакоў не адрозьніваецца вялікай закаханасьцю да фонтазіі? У адных гэты гэроізм—романтыка, энтузіязм, фантазія выліваецца ў адной форме, у другіх—у другой.

У гады грамадзянскай вайны сярод большасьці моладзі было шырока распаўсюджана так званае прыгодніцтва: паехаць на фронт... і ня дзіўна, што было шмат моладзі, добравольцаў у партызанскіх атрадах, у атрадах па барацьбе з бандытызмам, адважных, упартых рэволюцыйных партызанаў і армейцаў, якія вельмі добра змагаліся з ворагамі.

Але прайшлі гады грамадзянскай вайны, адышла на задні плян і яе романтыка. Наступілі дні суровай крапатлівай будзённай працы. Адбудоўваньне гаспадаркі краіны, індустрыялізацыя краіны, коопэраваньне вёскі, перабудова на соцыялістычны лад,—усё гэта вялікая, складаная задача пролетарыяту.

### Ці можа тут энтузіязм, гэроізм, романтыка знайсьці сабе месца?

Вядома—можа! Бязьмежнае поле для гэройства, рэволюцыйнай романтыкі ў будаўніцтве. Вось куды трэба дзяваць сваю энэргію, сілу і гэроізм.

Але не хвалюе, ня прываблівае некатэрых сумна настроеных гэта вялікая, але крапатлівая праца. Разумеецца, вынікі гэтай працы куды даўжэй праяўляюцца, чым, скажам, замахнуў шаблю—і няма галавы белагвардзейца. І многія не змаглі, як належыць адкрыць вочы і разгледзець нашу працу. І яны рвуцца ўперад,

### чагосьці шукаюць,

імкнуцца сваю сілу і энэргію выліць у якое хочаш «гэройства», але толькі не ў вялікую будаўнічую працу савецкай улады.

### Яны паддаюцца на вудачку опозіцыі,

вельмі спакушаных лоўкіх політыканаў. Гэтую моладзь прываблівае падпольная фракцыйная барацьба. Асобы некаторых выдатных опозіцыянэраў затушоўваюць усё астатняе. Яна лёгка паддаецца абману, паклепу, падтасоўваньням опозіцыі. Яе заманьвае гэта, быццам «рэволюцыйная праца». Але яна забывае самае галоўнае, што гэта «падпольле» ня супроць буржуазіі, а супроць комуністычнай партыі і пролетарскай дыктатуры. Опозіцыя ахвотна і ўмела выкарыстоўвае гэта пачуцьце моладзі, б'е на самае лёгкае пачуцьце: вось дзе, бач, у нас бюрократызм, перараджэньне, тэрмідор, улада кучкі дыктатараў і г. д. і г. д. І неспакусныя малаверы і моладзь вераць гэтаму, лёгка паддаюцца здрадніцкаму ўплыву.

### Хто падтрымлівае опозіцыю?

Зусім не выпадкова, што лягчэй за ўсё і больш усяго паддаецца ўплыў опозіцыі ў большасьці сваім вучнёўская і інтэлігэнцкая моладзь. Бо яна найбольш хістаецца, найбольш неўраўнаважана, яна найболш рознакалёрная, складаецца з розных соцыяльных пластоў, больш зьвязана з дробна-буржуазнымі пластамі насельніцтва, сярод якіх нямала нездаволеных партыяй і ўладаю.

Яны вельмі спачуваюць і падтрымліваюць опозіцыю.

Трэба толькі паглядзець на соцыяльны склад выключаных з партыі і комсамолу опозіцыянэраў, каб лягчэй за ўсё пераканацца ў гэтым.

### Ня з просту опозіцыя робіць стаўку на комсамол

і моладзь. Ня раз яна ўжо спрабавала паставіць моладзь супроць партыі. Для гэтага яна ільсьціла. Яна знаходзіла асобных адзінак комсамольцаў, якія лёгка паддаюцца ўплыву опозіцыі.

**Але ў цэлым пролетарская моладзь хутка пачынала разумець меншавіцкую сутнасьць опозіцыі.** За тое асобныя інтэлігэнцтвуючыя адзінкі хутка і лёгка ўцямілі вучэньне троцкізму.

Большасьць здаровай рабоча-сялянскай моладзі накіроўвае сваю энэргію, уражлівасьць, энтузіязм ведаў і рэволюцыйную романтыку на вялікую справу будаўніцтва соцыялізму, дапамагаючы пролетарыяту ўмацоўваць Савецкі Саюз. Партыя і пролетарыят заклікаюць моладзь

### да жывой творчай будаўнічай працы.

Яна ахвотна адклікаецца. Яна будуе коопэрацыю. Яна змагаецца з рэшткамі тэхнічнай адсталасьці, бюрократызму, безгаспадарнасьці, хуліганства. Яна вядзе ўпартую працу па будаўніцтве новай гаспадаркі на соцыялістычных пачатках.

Вось куды трэба і ў далейшым накіроўваць энтузіязм моладзі. **В. Красны**

# Супроць недысцыплінаванасьці і разгільдзяйства!

## Чаму на фабрыцы „Везувій“ губляюцца лепшыя комсамольцы, а з 450 чалавек моладзі ўцягнута ў комсамол толькі 200?

## Комсамольцы менскіх ячэек МББ чыгункі і шкляной гуты нядбайна адносяцца да абавязкаў, нават „спэкулююць“, а бюро ячэек зьвяртае ноль увагі на гэтыя зьявішчы.

## „Акакіям Акакіевічам“ ня месца ў комсамоле!

**Надзвычайная складанасьць пераджываемага намі пэрыоду пролетарскай рэволюцыі—небясьпека вайны, раскольніцкая праца троцкісцкай опозіцыі, якая разьвязвае рукі сіле контр-рэволюцыі—больш чым калі ставіць перад комсамолам задачу ўзмацненьня ўсёй сваёй працы па тэмпу, паляпшэньня яе па якасьці і самай рашучай барацьбы з недысцыплінаванасьцю.**

**Такія моманты, калі з-за сьпячкі, непаваротлівасьці, разгільдзяйства самага бюро ячэйкі, актыўнасьць рэбят накіроўваецца па шляху ненаведваньня сходаў, недысцыплінаванасьці на вытворчасьці, спэкуляцыі, уплаты сяброўскімі ўзносамі за алімэнты і, урэшце, выхаду з комсамолу,—павінны быць агнём выпечаны з нашых шэрагаў.**

**Абломавых, гогалеўскіх «Іван Іванычаў» і «Акакій Акакіевічаў» не павінна быць сярод комсамольцаў—Ленінцаў.**

**Хіба гэта дапусьцімае зьявішча, што на фабрыцы „Везувій“ з прычыны неправільнай разгрузкі комсамолец ня плаціў узносы ў працягу году і адышоў ад комсамольскай працы.**

**Мы яшчэ раз кажам, што кожная ячэйка павінна так пабудаваць сваю працу, стварыць такія абставіны, якія-б накіроўвалі, штурхалі актыўнасьць комсамольцаў па руслу ўздыму ў рацыяналізацыі прамысловасьці, барацьбы з бюрократызмам, уздыму сельскай гаспадаркі, ленінскай вучобы.**

**Трэба памятаць, што самадзейнасьць, творчасьць комсамольца, яго штодзенная думка, клапоты аб палепшэньні працы ячэйкі, аб уцягненьні моладзі ў гаспадарчую і культурную працу залежаць, галоўным чынам, ад таго, наколькі садзейнічаюць яму ў гэтым унутраныя ўмовы ячэйкавай працы.**

**Трэба памятаць, што ня толькі ад асабовых якасьцяй таварыша а і ад кіраўніцтва ячэйкі, ад ствараемых гэтым кіраўніцтвам абставін залежыць тое, ці зможам мы з комсамольцаў і моладзі падрыхтаваць людзей, думкі і праца якіх адпавядалі-б агульнаму, нячувала шпаркаму, тэмпу бягучага пэрыоду гісторыі.**

**Вось тое, што нам патрэбна і за што мы павінны змагацца.**

**Вось тое, што будзе рабіць пасьпяховай нашу барацьбу з недысцыплінаванасьцю, барацьбу за ўцягненьне самых шырокіх мас моладзі ў соцыялістычнае будаўніцтва.**

## Разьвінцілася гайка!

**(Копыль, Меншчына).**

За апошнія часы ў нашай організацыі значна пахіснулася дысцыпліна. Разам з ёю і зацікаўленасьць да працы. Комсамольская «гайка» разьвінцілася ва ўсіх адносінах. Комсамольцы не наведваюць сходы ячэек, некаторыя з іх пачынаюць п'янстваваць і гуляць у карты.

Былі выпадкі, калі комсамольцы не плацілі сяброўскіх узносаў па 7-8 месяцаў і ячэйкі ня прымалі ніякіх мер.

У сялянскай ячэйцы ўпаўнаважаны па збору сяброўскіх узносаў **Шкірыч**, з прычыны алімэнтаў растраціў усе грошы.

А што зрабіла ячэйка? Нічога. Быў скліканы на 6 гадзін вечару аб'яднаны сход двух ячэек КСМ з ячэйкай КП(б)Б. На сход замест 45 комсамольцаў прышлі зарэгістравацца 15, частка якіх потым уцякла ў нардом на спэктакль.

Сорамна так рабіць, комсамольцы, асабліва ў той час, калі становішча нашай краіны патрабуе асаблівай згуртаванасьці шэрагаў, асаблівага ўзмацненьня дысцыпліны, павышэньня якасьці працы.

Райком, зьвярні ўвагу на гэты бок працы.

**Цімашок Ракіта.**

## Аб персіках, нагрузцы і абломаўшчыне.

**(Менск, Кастрычнікавы раён).**

Зараз, калі ў Менскай комсамольскай організацыі пачалася барацьба за дысцыплінаванасьць, я хачу выказаць на старонках газэты аб хворых зьявішчах у організацыі, аб іх характары і барацьбе з імі.

Возьмем **колектыў цягі МББ чыгункі.**

У летні час, на працягу трох месяцаў, ня толькі не вялася масавая праца, але і сходы не праводзіліся. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што з боку кіруючага актыву ня было праведзена належнай працы па падрыхтоўцы да пераходу на летнія формы працы. Бюро колектыву, як гаворыцца, гультайнічала па-абломаўскі адкладвала працу на «заўтра».

Такія моманты меліся і ў **іншых ячэйках раёну**.

Калі спынялі працу прадпрыемствы (у часе адпускной кампаніі) на месяц, на паўтара, дык і праца ячэйкі таксама «спынялася». Ня было ніякага вучоту, дзе комсамолец праводзіў свой час, што рабіў. А часам комсамольцы хуліганілі, сходаў не наведвалі. А калі запыталіся, чаму, адказвалі:

— Туды-сюды езьдзіў!

У часе водпуску комсамольцы з чыгункі займаліся нават спэкуляцыяй. Едуць у Крым, на Украіну, купляюць персікі, абрыкосы і прадаюць. Аднаго комсамольца я запытаў:

— Як правёў свой адпачынак?




— А так сабе, падзарабіў рублёў 40.

— Як гэта?—А так, езьдзіў у Хэрсон, браў фрукты і прадаваў.

Выпадкаў такіх сярод чыгуначнікаў моладзі шмат. (Хлапцы маюць дармовы білет для праезду). А комсамольская ячэйка не прыдае гэтым выпадкам асаблівай увагі.

### Замест нагрузкі—ходзіць з... сабакам

**У ячэйцы цягі** маецца комсамолец, які ня хоча браць ніякай нагрузкі. Яго звычайны адказ:

— Заняты!

А на самой справе ў вольны час, (у яго часу мабыць шмат) бярэ на вяроўку сабаку (нямецкай пароды) і па вуліцы Савецкай маленькім крокам расхаджвае то ўперад, то ўзад. Ячэйка аб гэтых фактах ведае, але нічога покуль што ня робіць.

### «Навошта мне ячэйка?»

**На шкляной гуце** быў такі выпадак. Скарацілі рабочых, у тым ліку і комсамолку **Самовіч**. Яна хутка спыніла наведваньне сходаў ячэйкі, кінула даручаную працу. Калі запыталіся: Чаму не наведваеш?—адказала:

— Навошта мне ячэйка, калі яна ня хоча даць мне працу?

### Баіцца... палякаў.

Комсамолец **Урбановіч** ніякага ўдзелу ў працы ячэйкі ня прымаў. Калі яго запыталі аб прычынах, ён сказаў:

— Я не хачу ўмешвацца ані ў якую працу ячэйкі таму. што прыдуць палякі, дык на сьпіне выражуць «зьвёзды».

Ня гледзячы на растлумачэньне, ён застаўся пры сваёй думцы, а потым здаў комсамольскі білет.

Далей, калі комсамолку **Карась** зьнялі з піонэрскай працы за дрэнныя адносіны, яна ў ячэйцы ўтварыла фракцыю. якая ставіла сваёй мэтай агітаваць дзяўчат за выхад з Комсамолу. Бюро ячэйкі даведаўшыся аб гэтым, выклікала яе на пасяджэньне, але яна стала лаяць бюро.

* * *

Вось некалькі фактаў характэрнага зьместу. Іх у нас шмат і ячэйкі не вядуць належнай барацьбы з імі. Паміж іншым пастаноў, рэзолюцый, гутарак па гэтых пытаньнях хоць адбаўляй. Мне здаецца, што вакол кожнага хворага выпадку трэба ў ячэйцы ствараць агульнамасавы погляд, каб яго другія не перайнялі. У нас увайшло ў прывычку—сакратар даведаўся, ну, а калі заявы няма, дык што зробіш.

Такога погляду не павінна быць. Масавымі мерапрыемствамі трэба весьці барацьбу з тымі выпадкамі, якія маюць месца ў нашай організацыі.

**М. К.**



## Адкуль узяліся асобныя „шляхі-дарожкі“?

**(Нова-Беліца, фабрыка «Везувий»).**

Асобная частка моладзі фабрыкі, якая ўліваецца ў наш саюз,—гэта сыры чалавечы матар'ял, які трэба апрацаваць. 18-цігадовы хлапец, падаючы заяву ў ячэйку, чакае ад організацыі, каб яна ўзброіла яго вопытам і ведамі, паказала яму месца ў жыцьці. І калі організацыя з першых-жа крокаў уцягне яго ў актыўнае абгаварэньне ўсіх політычных пытаньняў, у конкрэтную барацьбу з бюрократызмам, безгаспадарнасьцю, за рацыяналізацыю вытворчасьці, калі яна забясьпечыць яму самадзейнасьць, удзел ва ўсіх галінах грамадзкага жыцьця і дасьць сапраўды зьвязаныя з жыцьцём веды ленінізму—ён вырасьце комуністым. Калі-ж, «сунуўшы» яму для прылічча якую-небудзь «нагрузку», мы разам з тым дадзім адчуць яму, што ён лішні ў саюзе, што ён «29 кола ў калясьніцы»—ён адыйдзе ад нас і будзе шукаць свае асобныя ад організацыі «шляхі-дарожкі».

Возьмем да прыкладу **Жэўнага Сярожу.** Ён комсамолец з 24 году, працуе на фабрыцы. Быў ён прыкладным комсамольцам, скончыў політшколу першай ступені, добра разьбіраўся ў пытаньнях вытворчасьці, грамадзкага і комсамольскага жыцьця, нёс нагрузку цэх-організатара і быў сябрам бюро цэхавай ячэйкі. Але потым яго «разгрузілі», ён адышоў ад працы. Расчараваўся ў комсамоле, не плаціў сяброўскіх узносаў у працягу ўсяго 1927 году. Чаму? Гэтага пытаньня ячэйка і колектыў сабе ня ставілі.

### Якія прычыны адыходу

гэтага актыўнага комсамольца? Па-першае, хлапцу дрэнна жылося ў сям'і. Мачыха не жадала, каб ён быў комсамольцам. Дрэннае хатняе становішча адбівалася на працы. Комсамольцы ня толькі не дапамагалі яму таварыскай парадай, альбо хоць таварыскім спачуваньнем, але нават сьмяяліся. Ён пайшоў ад



Чым бываюць хлопцы на заводзе.

бацькі на прыватн ю кватэру. Атрымліваючы 55 рублёў пэнсіі, ён ня меў магчымасьці плаціць за кватэру, ня м[illegible] «зьвесьці канцы з канцамі» бо прывык жыць «на шырокую ногу». Нарэшце, зноў зьвярнуўся дамоў. Пасябраваўся з беспартыйнымі хлапцамі. Паехаў на экскурсію ў мястэчка Злынак і напіўся там «сарака-градуснай». Прыехаўшы, п'яны **Жэўнаў** у бойках моцна паразаў беспартыйнаму хлапчуку рукі. Фабком выключыў комсамольца з саюзу. Ячэйка ставіла пытаньне аб яго выключэньні, не паклапаціўшыся даведацца аб прычынах такога рэзкага пералому.

Вось і другі хлапец **Дрыноўскі Васіль**,—адзін з лепшых комсамольцаў нашай фабрыкі. Ён даўно ўступіў у Комсамол, на кожнай вытворчай нарадзе высоўваў прапановы аб «спазьненьнях», «аб майстру», на ячэйцы—аб барацьбе з хуліганствам, аб перавыбарах дрэннага сакратара і г. д. І калі ён бачыць, што яго прапановы, хай перарobленыя ў працэсе масавага абгаварэньня, даюць практычны вынік, ён яшчэ з большай упартасьцю бярэцца за працу. Але тут ёсьць у нас адно зло: організацыя ня можа выхоўваць такіх хлапцоў і ня можа іх трымаць у сваіх руках.

**Дрыноўскі Васіль** працуе ў якасьці накладчыка, зарабляе да 90 рублёў у месяц. Жыве ён адзін. Ёсьць у яго жыцьці недахоп—ня можа весьці ён культурнага жыцьця. Абкружаюць яго беспартыйныя хлапцы, прапануюць заходзіць у піўную. Хутка піць стала прывычкай. А потым і адыход ад працы, дзякуючы таму, што сваечасова не папярэдзілі гэтага падзеньня.

## Юнацкая праца і опозіцыя.

### Спэкуляцыя опозіцыі.

Опозіцыя ў сваёй разбураючай працы супроць партыі і комсамолу асабліва моцна спэкулюе па пытаньнях юнацкае працы.

Опозіцыя ўзводзіць ня толькі на ЦК, але і на ўвесь комсамол, які налічвае да 700 тысяч рабочай моладзі, цяжкае абвінавачваньне ў тым, што **„ЦК ня мог адстаяць законаў аб працы і адукацыі моладзі, вызначаных пры Леніне“.**

Опозіцыя абвінавачвае комсамол у слабай абароне **«экономічных позіцый рабочай моладзі»**. Тым самым яна абвінавачвае і рабочую моладзь.

Опозіцыя кажа **„аб адсутнасьці адпору бюрократычным скажэньням з боку комсамолу“**. Пры гэтым яна мае на ўвазе гарадзкія і фабрычна-завадзкія організацыі, але забывае, што рабочая моладзь у іх складае па ўсіх асноўных цэнтрах ня менш 70 проц. агульнага ліку членаў саюзу.

Выходзіць, што рабочая моладзь не забараняе сваіх інтарэсаў. Ня кругла што-сь у опозіцыянэраў атрымліваецца.

Хто гэтаму паверыць? Ласьне мы ня бачым паляпшэньня становішча рабочай моладзі?

### Ці зьніжаецца зарплата?

На самой справе, зарплата рабочых падросткаў у 1924 годзе складала—**16 р. 77 кап.**, у 1925 г.—**19 р. 17 к.**, у 1926 г.—**22 р. 40 к.** Усякі можа ўбачыць, што пагаршэньня экономічнага становішча **няма.**

Опозіцыянэры згаджаюцца з тым, што рост зарплаты ёсьць, але вось кажуць яны, пачынаючы з 1921 году рост сярэдняй зарплаты падростка адстае ад росту сярэдняй зарплаты дарослых рабочых.

Але гэта зусім не азначае, што пагаршаецца экономічнае становішча рабочай моладзі наогул,—яно адстае толькі параўнаўча з становішчам дарослых рабочых.

Акром таго, опозіцыянэры забыліся, што ў 1921 годзе зарплата ўсіх рабочых будавалася на ўраўніцельнасьці і складала яна ўсяго **6 р. 95 кап.** І няма чаго зьдзіўляцца, што падростак атрымліваў тады **63 проц.** Зарплаты дарослых рабочых, альбо **4 р. 40 кап.**

Опозіцыя хавае ад рабочай моладзі два факты.

**Першы,** што з моманту аплаты па кваліфікацыі (замест ураўніцельнай аплаты за працу (сярэдняя зарплата падросткаў у адносінах да сярэдняй зарплаты ўсіх рабочых адстала на **6,8 проц.**, а наогул—павялічылася ў **тры разы**, у той час, як зарплата некваліфікаваных рабочых у 1926 годзе ў нафтавай прамысловасьці адстала ад зарплаты высокакваліфікаваных рабочых у 8 разоў.

А трэба памятаць, што ў 1921 годзе чорнарабочы атрымліваў амаль аднолькавую зарплату з кваліфікаваным рабочым. Значыць, адносна зарплата нізка аплачваемых рабочых адставала больш, чым зарплата падросткаў. Опозіцыя гэта ведала і ні разу не протэставала.

**Другі факт.** Сёмы зьезд профсаюзаў адзначыў, што такі вялікі разрыў у аплаце працы кваліфікаванага і некваліфікаванага рабочага, які стварыўся за пэрыод з 1921 году па 26-ты год,—**не нормальны** і даў **паказаньне аб падцягваньні зарплаты нізка аплачваемых груп рабочых.**

Вынікі коллдагаворнай кампаніі 1926 году паказваюць, што гэта паказаньне профсаюзаў **выконваецца**; зарплата нізка аплачваемых груп рабочых (чорнарабочыя, жанчыны і вучні) за 1927 год расьце **шпарчэй**, чым зарплата ўсіх рабочых, а сярэдняя зарплата падросткаў паднялася да **26 руб. 34 кап.** у месяц супроць **22 р. 40 кап.** у 1926 годзе.

Такім чынам, новая вучнёўская сетка **ніякага зьніжэньня зарплаты** ні зараз, ні ў далейшым, як-бы ні хацела даказаць опозіцыя, **не дае.**

Ці не яскрава, што за апошні год мы маем параўнаўча большае паляпшэньне экономічнага становішча рабочых падросткаў, чым усіх рабочых. Мы зьнішчаем недахопы ў аплаце працы падросткаў, якія стварыліся за гады НЭП'у, а опозіцыя гэту работу **празявала.**

### Правільна разьмеркаваць броню.

Опозіцыя абвінавачвае комсамол у дапушчэньні зьмен **вылічэньня** норм броні. **„Вы дапусьцілі парушэньне асноў законаў аб працы рабочай моладзі,—кажа яна.**

Але яна не падумала аб тым, што сутнасьць закону аб броні выяўляецца ў самым **існаваньні броні**, а ня ў прыёмах яе вылічэньня.

Броня не адменена. Застаецца **без усякіх зьмен** і 123 артыкул кодэксу законаў аб працы. Прыемы-ж вылічэньня норм броні пераглядваюцца ў сувязі з разьвіцьцём прамысловасьці. Было-б дрэнна, калі-б броня не пераглядвалася.

Старыя нормы броні прывялі-б да **разбурэньня вытворчасьці**. На самай справе, як можна астаўляць старыя нормы броні па ўсёй, скажам, хэмічнай прамысловасьці, калі па фарфарафаянсавай галіне колькасьць рабочых у папярэдняе пяцігодзьдзе будзе **скарачацца** тады, як у асноўнай галіне хімпрамысловасьці яна будзе **павялічвацца?**

Калі мы заставім старыя нормы броні па фарфарафаянсавай прамысловасьці, то мы ня толькі будзем мяшаць паляпшэньню вытворчасьці, але мы таксама **будзем рыхтаваць** з часткі забраніраваных падросткаў кваліфікаваных рабочых **для біржы працы**, бо ўсіх іх прадпрыемствы ня змогуць зьмясьціць.

А опозіцыя прапануе заставіць старыя нормы броні, такім чынам, **супроцьстаўляючы** інтарэсы падросткаў—часткі рабочае клясы—інтарэсам усяе рабочае клясы.

Опозіцыйныя вумнікі, крычучы аб зьніжэньні норм броні, аб павялічэньні беспрацоўя сярод падросткаў **не захацелі паглядзець крыху ўперад.**

К канцу прадстаячага пяцігодзьдзя прырост гарадзкога падросткавага насельніцтва скарачаецца на цэлых **48 тысяч** чалавек у год.

Пагэтаму з беспрацоўем сярод падросткаў у нас справа будзе абстаяць куды лепш, чым зараз.

Але з беспрацоўем юнацтва, прырост якога штогодна павялічваецца і к канцу пяцігодзьдзя складзе на 20 проц. больш, чым зараз—справа будзе многа складаней. І не аб зьніжэньні норм броні трэба зараз крычаць, а **аб правільным іх устанаўленьні.** Трэба змагацца з беспрацоўем сярод падросткаў, але **ня трэба забываць** і рабочага юнацтва.

### Кастрычнікавыя заваёвы ня зданы.

Лінія партыі, ЦК і Комсамолу ў цэлым была, ёсьць і будзе ў далейшым выяўляцца **ва ўсё большым пашырэньні соцыялістычнай організацыі юнацкае працы, у далейшым уздыме зарплаты, далейшым усямерным уздыме культурнага ўзроўню рабочай моладзі.**

Мінулы год быў годам вялікіх іспытаньняў і цяжкасьцяў для комсамолу ў пытаньнях працы і адукацыі рабочай моладзі ў сувязі з пераходам да новага пэрыоду разьвіцьця нашае гаспадаркі.

Мы мелі вялікі напор з боку бюрократычных элемэнтаў некаторых гаспадарчых органаў на пытаньні працы і адукацыі рабочай моладзі.

Але комсамол у цэлым і яго ЦК вытрымалі гэты націск, і **ня толькі не здалі кастрычнікавых заваеў для рабочай моладзі, а наадварот, праводзяць цьвёрды курс у процівагу панікерам, якія спатыкаюцца пры крутых паваротах.**

**ЯРОГАЎ.**

# Як хто адзначыў Кастрычнік.

## Конкурс „Чырвонай Зьмены“ і кастрычнікавай камісіі.

**Мала-стахаўскія комсамольцы 45 дзён рыхтаваліся да сьвята.—У кожным мерапрыемстве ячэйкі прымалі актыўны ўдзел пажылыя дзядзькі і жанчыны.—Такой урачыстасьці, якую наладзілі комсамольцы ў дні Кастрычніка, маластахаўцы ніколі ня бачылі.**

## Уся вёска сьвяткавала вялікі Кастрычнік

### № 6 Мала-Стахаўская ячэйка ЛКСМБ, Барысаўскі раён.

### 45 „гарачых“ дзён.

За паўтара месяцы падрыхтоўкі да Кастрычнікавых дзён, наша комсамольская ячэйка прарабіла наступнае:

Спачатку на бюро, а потым і на агульным сходзе ячэйкі мы абгаварылі **характар сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя Кастрычніка і якія патрэбна скласьці ўмовы для яго пасьпешнага правядзеньня.**

У мэтах лепшага ўдзелу ячэйкі ў гаспадарчым будаўніцтве вёскі ў сувязі з сьвяткаваньнем дзесятай гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі, ячэйкай **вызначан трохгадовы плян працы ў гэтай галіне, які быў абгаваран на агульным сходзе моладзі і сялян вёскі.** Для большага скарыстаньня вопыту гаспадарчага будаўніцтва, які ёсьць у комсамоле, ячэйка на сваіх агульных сходах **прапрацавала з «Чырвонай Зьмены» матар'ялы аб працы Задубскай ячэйкі.** На гэтых сходах прысутнічала амаль уся вясковая моладзь і шмат дарослых сялян.

### Колектыў на балоце.

Каб дапамагчы вясковаму мэліорацыйнаму таварыству, ячэйка сумесна з беспартыйнай моладзьдзю правяла па балоце суботнік, выкапаўшы там канаву. На палову заробленых грошай купілі для таварыства рыдлёўкі, а другую палову ўклалі ў асноўны капітал таварыства.

Гэтак сама быў праведзен суботнік і лётарэя на карысьць бяспрытульных.

За тыдзень да сьвяткаваньня правялі **вечар сялянскай моладзі** з дакладам аб гісторыі Кастрычнікавай рэволюцыі. Такі-ж сход быў праведзен і ў дарослых сялян. **Падрыхтавалі сямейны вечар, са сьвяточным полуднем, на сродкі, якія сабралі шляхам падпіснога ліста. Выпусьцілі насьценную і сьвятавую газэты.**

**Яшчэ за тры дні да сьвята пачалі ўпрыгожваць вуліцу вёскі, хаты, клюб і школы. Гэту працу выконвалі комсамольцы, піонэры. а таксама і частка беспартыйнай моладзі,** дапамагалі нават і пажылыя дзядзькі. У выніку ўжо ў суботу ўвечары можна было бачыць на канцох вёскі дзьве аркі, упрыгожаныя зеленьню, рознаколернай паперай і гаручымі наверсе чырвонымі зоркамі. Амаль уся вуліца вёскі была ўсна-вана папярок гірляндамі з зелені, пераплеценымі чырвонай паперай. На кожнай хаце вісеў чырвоны сьцяг з літарамі БССР, а ў сярэдзіне кожнай хаты з кута ў кут былі нацягнуты ніткі з нанізанымі на іх папяровымі сьцяжкамі. У многіх хатах сьцены былі ўвешаны плякатамі і портрэтамі правадыроў. Клюб і школу таксама ўпрыгожылі.



**Многія хлапцы і дзяўчаты пашылі к сьвяту новую вопратку.**

Ува ўсіх мерапрыемствах па падрыхтоўцы прымала актыўны ўдзел моладзь і дарослае сялянства. Ячэйка ў камісію па падрыхтоўцы ўцягнула шэраг пажылых сялян, якія старанна выконвалі даручаныя ім заданьні. Напрыклад, **адзін стары дзядзька зрабіў зорку, цёткі дапамагалі дзяўчатам плесьці гірлянды, маладзейшыя хлапцы будавалі аркі і інш.**

### Ніколі нябачная ўрачыстасьць.

Вячэрні змрок пачынаў садзіцца на стрэхі вясковых хат, хаваючы ў сябе хвалістае разьвейваньне чырвоных сьцягаў. Цішыню падвячорку прарэзалі тоненькія гукі вясёлай дзетвары, якая ішла на піонэрскі збор.

7 гадзін. На канцох вёскі загарэліся чырвоныя зоркі. Гэта было сыгналам—для **«пераходу вёскі на сьвяточнае становішча».**

У нядзелю ўся моладзь і большая палова дарослых сялян вёскі, на чале з комсамолянскай ячэйкай і піонэрскім атрадам, пайшлі ў суседнюю вёску **Бытча** за 3 вярсты, каб сумесна ўсім сельсаветам адзначыць дасягненьні, падагульніць свае сілы перад мясцовай уладай, перадаць праз яе **шчырую падзяку кіраўніку рэволюцыі і будаўніцтва новага жыцьця—Комуністычнай партыі.**

Нядзельны вечар. Тая-ж самая сьвяточная краса вёскі абнавілася яшчэ чырвонымі асьветленымі літарамі на шыльдзе клюбу.

**«Уся моладзь і дарослыя вёскі, калі ласка зайдзеца на шклянку чаю».** Праз кароткі час клюб быў перапоўнен насельніцтвам вёскі, сярод якіх і госьці, раней запрошаныя ячэйкай.

Сакратар комсамольскай ячэйкі, вясковая дзяўчына, абвясьціў вечар адчыненым, атрымаўшы ў адказ дружны сьпеў беларускай марсэльезы. Програма вечару была такога зьместу: **урачыстая частка, невялічкі даклад аб гаспадарчых дасягненьнях за 10 год, дэмонстрацыя асобных фактаў з дасягненьняў пры дапамозе чароўнага ліхтара, сьвяточная вячэра, увесяліцельная частка з музыкай, на працягу двух апошніх частак—лётарэя на карысьць бяспрытульных.**

Скончыўшы з вялікай урачыстасьцю дзьве першыя часткі вечару, усе прысутныя разьмясьціліся за сталы, на якіх была падрыхтавана закуска і па бутэльцы «на брата» піва. У радасьці і вясельлі было выказана многа тостаў на карысьць разьвіцьця нашай рэспублікі.

З вясёласьцю выскаквае з натоўпу Янка, які ажыўлёна гаворыць: **браткі, за дзьве капейкі выйграў цэлую клець жыта,** падносячы да Андрэева носа невялічкую кніжачку, на якой вялікімі літарамі напісана: **«Што трэба вэдаць, каб многа жыта нажаць».**

На вечар прышла з піонэрскага вечару павадыр атраду тав. Ліда і апавясьціла нас з вялікай радасьцю аб тым, што і **іх дзіцячы вечар прашоў вельмі добра, дзеці дружна гулялі, пасьля вячэры частавалі дзяцей яблыкамі і цукеркамі...**

Вечар зацягнуўся да 3 гадзін. Калі ўжо вывальвалі за музыкам з клюбу на вуліцу, нехта ўнёс прапанову—**заўтра організаваным парадкам пайсьці ў Барысаў на дэмонстрацыю. Т. Качан.**

# Чакаем судовага процэсу!

**Умовы, якія штурхнулі Казлоўскую на самазабойства, існуюць яшчэ і на некаторых іншых прадпрыемствах. Комсамольскія ячэйкі павінны заразжа ўжыць усе захады да зьнішчэньня гэтых умоў.**

## Прокуратура расьсьледуе справу,

### так заяўляе Наркомʼюст і генэральны прокурор т. Сэгаль.

Цяжкое ўражаньне застаецца пасьля чытаньня ў «Чырвонай Зьмене» матарʼялу аб самазабойстве тав. Казлоўскай.

Здавалася-б, што цяжкія ўмовы, у якіх апынулася Казлоўская, павінны былі выклікаць спачуцьцё і падтрыманьне яе акаляючых, у першую чаргу комсамольцаў. Але-ж не! Спатыкаючы да сябе адны нячулыя нечалавечыя адносіны, забітая, затраўленая Казлоўская атруцілася.

Мала таго, што давялі комсамолку да самазабойства. Судзячы па заметцы «Хто вінаваты», ня было нават прынята належных захадаў да аказаньня ёй дапамогі з боку тых, ад каго гэта належала.

Дарэмна білася таварышка атруціўшайся комсамолкі, якая хацела яе адратаваць; яна наткнулася на бяздушныя адносіны, злачынны формалізм. Казлоўская так і памерла, нявыратаваная ўрачом.

Гэтая справа павінна зацікавіць усё наша грамадзянства і ў першую чаргу комсамольскія організацыі. З свайго боку **прокуратура рэспублікі таксама зацікавілася гэтым фактам і ўзялася за яго расьсьледваньне.**

Агульнымі сіламі мы выкрыем тых, хто вінават у самазабойстве Казлоўскай і прымусім іх трымаць адказ за свой учынак перад пролетарскім судом.

## Што кажа моладзь вёскі.

### Слова маладога селяніна, Заслаўскага раёну, тав. Траецкага.

Прачытаўшы старонку аб самазабойстве Казлоўскай, нашы вясковыя хлопцы не знаходзілі слоў, каб выявіць сваё абурэньне таму бюрократызму, хуліганству і распутству, што пануе на шкляным заводзе «Комінтэрн».

З цяжкасьцю верыцца, каб ня было ніводнай сьветлай плямы на завадз ім фоне. І адміністрацыя, і майстры, і завадская моладзь, і дактары, як-бы згаварыўшыся між сабой, робяць усе адну справу—топчуць у гразь жыцьцё маладой сіраты—комсамолкі і даводзяць яе да самазабойства.

Калі-ж апошняе здарылася, сваімі нядбайнымі і казённымі адносінамі яны не аказваюць ёй ніякай дапамогі і, як можна зразумець з артыкулу «Хто вінаваты», нават задаволены яе сьмерцю.

Затое з якім задавальненьнем чытаем зьмешчаныя ў апошніх нумарох газэты артыкулы т. т. Калініна і інш. Прыемна чуць, што адказныя савецкія і партыйныя працаўнікі ўзяліся за расьсьледваньне гэтай кашмарнай справы і не пакінуць без кары тых, хто штурхануў Казлоўскую прыняць атруту.

## У чым сакрэт самазабойства.

### Слова вучня МШВ, тав. Бялькевіча.

Той, хто лічыць, што завод «Комінтэрн» адзіны ў БССР, дзе маглі мець месца зьдзекі над завадзкімі дзяўчатамі і ўмовы, якія прывялі тав. Казлоўскую да самазабойства, — той глыбока памыляецца.

Трэба прама сказаць, што на некаторых нашых прадпрыемствах яшчэ ня выжыты канчаткова погляд—«Курыца ня птушка, баба не чалавек». Горш усяго тое, што гэты погляд існуе ня толькі ў старых майстраў, якія мараць аб дарэволюцыйных часох, але і сярод некаторых маладых рабочых.

Не сакрэт, што цяжка даецца кваліфікацыя дзяўчыне, паступіўшай на завод. Ёй прыходзіцца ня толькі перамагаць «прамудрасьць» вытворчасьці, але і пагардлівыя, нетаварыскія адносіны з боку пэўнай часткі рабочых.

Наступова пагардлівыя і бяздушныя адносіны да маладых работніц зьнішчаюцца, ўступаючы сваё месца таварыскаму абыходжаньню. Але гэты процэс праходзіць павольна і не без ахвяр, аб чым і сьведчыць самазабойства Казлоўскай.

Мы не гарантаваны ад таго, што выпадак з Казлоўскай будзе апошнім. Весь чаму неабходна наладзіць паказальны процэс над вінавайцамі сьмерці комсамолкі, каб папярэдзіць падобныя ўчынкі ў далейшым.



*Міжнародны агляд*

# Комунізм пераможа!

**Рост уплыву комуністых на рабочыя масы Нямеччыны.—Эстонскі міністр унутраных спраў—натхніцель антысавецкай кампаніі.—**

**Працоўная моладзь усіх краін лічыць Савецкі Саюз сваёй бацькаўшчынай.**

### Новыя посьпехі нямецкай компартыі.

Месяц таму назад мы пісалі аб буйнай перамозе комуністычнай партыі Нямеччыны на выбарах у Гамбургу і Кенігсбэргу.

Зараз-жа ізноў, у такіх буйных гарадох, як Брэмэн і Гэсэн, комуністы маюць значныя посьпехі пры выбарах у гарадзкія самакіраўніцтвы (думы).

Выбары ў Гэсэне далі наступныя вынікі: комуністычная партыя атрымала 41 тысячу галасоў (тады як на мінулых выбарах толькі 34 тысячы).

Соцыял-дэмократы атрымалі 157 тысяч, супроць 220 тысяч, якія яны атрымалі на мінулых выбарах.

Лічбы галасоў, якія атрыманы буржуазнымі партыямі, мы ня будзем прыводзіць.

Досыць сказаць адно, што ўсе партыі Нямеччыны, акрамя комуністычнай, страцілі ў гэтых выбарах лік галасоў.

Такое-ж самае становішча маецца і на выбарах у Брэмэне.

Аб чым сьведчаць гэтыя лічбы?

Яны зьяўляюцца паказчыкам таго, што ня гледзячы на наліччы некаторага экономічнага ўздыму гаспадаркі Нямеччыны, «дэмократычная» глеба відавочна хістаецца.

Кіруючыя колы капіталістых з кожным часам трацяць свой уплыў на рабочыя масы.

Посьпехі комуністых на выбарах бессамненна значна большыя, чым соцыялзгоднікаў.

Асабліва гэта відаць на прыкладзе выбараў у Гэсэне, дзе комуністычная партыя аказалася аднэй з партый, якая павялічыла колькасьць галасоў, у параўнаньні з мінулымі выбарамі.




Да нападу белагвардзэйцаў на шанхайскае консульства.

Гэтыя факты надзвычайна цікавы.

Яны яскрава гавораць і паказваюць той зрух улева, які маецца ва ўсёй Нямеччыне.

Рабочая кляса Нямеччыны, навучылася добра адрозьніваць сваіх сяброў ад ворагаў.

Выхад з цяжкага становішча пролетарыі бачыць толькі ў перамозе комуністых.

З гэтай прычыны працоўныя масы падаюць свае галасы за комуністых, якія зьяўляюцца сапраўднымі барацьбітамі за справу рабочых.

Акрамя таго, вынікі выбараў у Нямеччыне, Польшчы і Чэха-Славакіі даюць адказ тым опозіцыянэрам, якія крычаць аб заняпадзе рабочага руху ў Заходняй Э ў р о п е, аб ні-быта павялічэньні партый соцыял-дэмократаў «за кошт комуністых».

Тады як гэта зусім наадварот. Уплыў комуністычных партый значна расьце, а соцыял-дэмократаў—падае.

«Крот рэволюцыі» у капіталістычнай Эўропе рые і рые нясупынна і моцна.

### Эстонскі ўрад — натхніцель кампаніі супроць СССР.

Адзін расійскі эмігрант, у верасьні гэтага году, паведаміў савецкаму паўнамоцнаму прадстаўніцтву ў Эстоніі аб тым, што нібыта падрыхтоўваецца напад на нашага прадстаўніка тав. Пятроўскага.

Але гэта паведамленьне аказалася провокацыйным.

Праз месяц, гэты-ж самы эмігрант паведаміў эстонскую паліцыю, нібыта адзін супрацоўнік савецкага прадстаўніцтва падгаварваў яго організаваць напад на нашага поўпрэда.

Атрымалася, такім чынам, што нашы прадстаўнікі організуюць напад супроць саміх сябе.

Гэтую провокацыю белагвардзейцаў скарыстаў гэтымі днямі эстонскі міністр унутраных спраў.

Ён запрасіў да сябе прадстаўнікоў друку і зрабіў паведамленьне аб дзейнасьці расійскай эміграцыі.

У гэтым паведамленьні зьмяшчаецца абвінавачаньне ў тым, што павялічаная актыўнасьць эмігранцкіх монархічных колаў знаходзіцца ў сувязі з інтрыгамі аднае суседняе дзяржавы.

Пад суседняй дзяржавай разумеецца СССР. Іншымі словамі, эстонскі ўрад адчынена абвінавачвае прадстаўнікоў СССР у тым, што яны разьвіваюць монархічны і белагвардзейскі рух у Эстоніі.

Але ўсе гэтыя думкі наскрозь хлусьлівы. Ува ўсёй гэтай бруднай гісторыі нас цікавіць адно—гэта сувязь эстонскага ўраду з белагвардзейцамі.

А гэта сувязь бязумоўна маецца.

Белагвардзейскі рух у Эстоніі асабліва ўзмацніўся ў сувязі з апошнімі падзеямі опозіцыі.

Ад Мікалая Мікалаевіча, нават, атрыман спэцыяльны загад аб тым, што ў сувязі з **становішчам у Расіі, якое выклікаецца дзейнасьцю опозіцыі, трэба ўзмацніць працу монархічных організацый.**

Ня можна не сказаць пра тое, што як бачыце «праца» нашых опозіцыянэраў, вядзе да ажыўленьня працы нашых ворагаў.

Цёмныя сілы, якія стаяць па-за сьпіною эстонскага ўраду, бруднымі, хлусьлівымі мэтадамі хочуць замаскаваць сваю злачынную дзейнасьць.

Але пад націскам грамадзкае думкі, якае не жадае ўскладненьня ў адносінах да СССР, ўсе злачынствы белагвардзейцаў будуць непасьпяховымі.

Пасьля сказанага, заява міністра ўнутраных спраў Эстоніі набывае тым больш дзіўны характар.

Савецкі ўрад за апошнія часы шмат разоў зьвяртаў увагу на спыненьне дзейнасьці расійскіх манархістых.

Зьяўляецца незразумелым жаданьне эстонскага ўраду выступіць з вышэй паданай заявай.

Замест рашучых мер супроць расійскіх эмігрантаў, міністр унутраных спраў падтрымлівае вэрсію провокатара.

Савецкі ўрад заявіў эстонскаму ўраду **рашучы протэст** з прычыны заявы міністра ўнутраных спраў прадстаўнікам друку.

### Міжнародная конфэрэнцыя замежных дэлегатаў рабочае моладзі.

16-га лістапада ў Маскве зачынілася міжнародная конфэрэнцыя замежных дэлегатаў рабочае моладзі, якія прыехалі ў СССР на сьвяткаваньне Кастрычніка.

На конфэрэнцыі ўдзельнічала 60 чалавек. Бурнымі воплескамі спаткалі дэлегаты генэральнага сакратара УсеЛКСМ т. Чапліна, які зрабіў даклад аб экономічных, політычных і культурных дасягненьнях СССР.

З дакладам аб ваеннай небясьпецы і задачах рабочае моладзі выступіў ангельскі дэлегат Кляйнсі.

„Мы пойдзем,—сказаў ён,—разам з расійскімі таварышамі, якія паказалі нам прыклад, як трэба змагацца».

Ад нямецкай дэлегацыі з дакладам выступіў Даль, які зазначыў, што ў будучай вайне асноўнаю мэтаю рабочае моладзі зьяўляецца адзіны фронт рабочых усяго сьвету супроць рэформісцкіх правадыроў і супроць вайны з СССР.

Прадстаўнікі розных організацый моладзі далі братэрскую клятву правадзіць актыўную працу на сваёй бацькаўшчыне.

А ў хвіліну ваеннае небясьпекі пайсьці на абарону першай у сьвеце соцыялістычнай дзяржавы.

— «Працоўнай моладзі Захаду і Ўсходу,—гаворыцца ў рэзолюцыі прынятай конфэрэнцыяй,—пакладзена адыграць аграмадную ролю ў барацьбе супроць вайны.

Моладзь—першая ахвяра імпэрыялізму. Яна першай павінна быць у шэрагах барацьбітоў супроць нападу на СССР.

Прадстаўнікі працоўнай моладзі будуць верны заветам правадыроў—Карла Лібкнэхта і Леніна“.

Рэзолюцыі заканчваюцца заклікам супроць імпэрыялістычнай вайны, за абарону Савецкага Саюзу—бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету.

**Алёнін.**

# „Так дам, што больш не папросіш!“

## Гаспадарчык Мікулянец зьбіў вучня Сагаловіча.

**Гэта не адзіночны выпадак.—У сувязі з кампаніяй перазаключэньня дагавораў гаспадарчыкі ўзьнялі галавы і спадзяюцца абмінуць законы аб працы моладзі.—Мы завастраем на гэтым грамадзкую ўвагу.—Мы патрабуем энэргічных захадаў супроць захаванай эксплёатацыі моладзі!**

### Выпадак з Сагаловічам.

Мінулае Антона Вікеньцявіча **Мікулянца**, саматужніка-шаўца—ніхто ня ведае.

Ды каму ведаць, калі Антон Вікеньцевіч тут, у Менску, толькі 2—3 гады жыве? Тугі на словы Мікулянец. Адна пакінутая ім жонка, зараз ледзь-ледзь пражываючая на свае мізэрныя заробкі хатняй краўчыхі, адна яна добра ведае, і праклінае **Мікулянца.**

Жонка туліцца ў халодным пакойчыку дзесьці на «мансардзе» двухпавярховага шкілету—будынку, быццам абкусанага нечымі зубамі, будынку з бязьлічнай колькасьцю шчылін, з поўразьбітымі шыбамі...

Цёмны калідор, косая столь, падскакваючыя пад нагамі палавіцы... Тут, у гэтым доме, побач з кватэрай жонкі Мікулянца, у пакоі разьмерам 2×2 жыве і вучыцца рабочы падростак **Сагаловіч**. Пакой ніколі не апальваецца, у ім няма падвойных вокан—і холад скоўвае дыханьне.

**Сагаловіч** расказвае аб сваім жыцьці; бацькі ўжо выветрыліся з яго памяці, яны пакінулі яго зусім малым; усе свае 20 год Сагаловіч скітаўся па сьвету ў шуканьні працы і кавалка хлеба.

І вось ужо 2 гады, як ён стаіць ля шавецкага варштату ў майстэрні Мікулянца. Гады прабеглі няпрыкметна. Праз зьнявагі і пабоі, праз зьдзекі і лаянку ён цьвёрда вышаў на свой жыцьцёвы шлях. **Сагаловіч** набыў кваліфікацыю. Але якою цаною ён атрымаў гэта!..



Вучань Сагаловіч.



Той, хто падняў кулак.

... Аднойчы летам, а 1-й гадзіне ўночы пачуўся страшэнны стук. П'яны **Мікулянец** ламаўся ў дзьверы. Урэшце, яму удалося выламаць іх, ён уварваўся ў пакой... Спачатку быў чуцен глухі шум за сьцяною, у кватэры яго жонкі, потым **Мікулянец** кінуўся да пакою **Сагаловіча**, выбіў шкло ў дзьвярах, сарваў іх і шавецкім крывым нажом парэзаў на дробныя кавалкі новую пырату на стале. Зрабіўшы гэта, ён прабіў стол наскрозь.

Паклікалі міліцыянэра і быў складзен акт. **Мікулянца** супакоіла міліцыя.

Але гаспадар сваіх прывычак не пакінуў. 9 лістапада, а 4-й гадзіне …ню ў яго майстэрні па Нова-Маскоўскай адбылася абураючая гісторыя.

**Сагаловіч у гэты дзень папрасіў выплаты грошай за дні кастрычнікавага сьвята,**

грошай, якія яму законна належалі. **Мікулянец** аблаяў яго матам і прыстрашыў:

— Маўчы лепей, бо так дам, што прасіць не захочаш!..

**Сагаловіч** тады сказаў, што ён зьвернецца ў групком і сваіх праў ня здасьць. Тым больш, што ён сам зьяўляецца профупаўнаважаным.

**Пачуўшы гэта, Мікулянец запёр дзьверы, схапіў амбус (вялікі цяжкі кавалак жалеза) і спусьціў яго па руцэ свайго вучня. Потым пачаў біць у твар кулакамі і душыць. Сагаловіч хрыпеў, вырываўся і крычэў. На вуліцы сабраўся натоўп... Праз некаторы час, значна спазьніўшыся, прышла міліцыя. Сагаловіча выратавалі... Урач канстатаваў пабоі па ўсім целе.**

Так адказаў на законнае патрабаваньне свайго вучня гаспадар **Мікулянец**, хуліган і п'яніца, вядомы ўсёй Нова-Маскоўскай вуліцы.

Важнае тут, што гэта не **адзіночны выпадак**, а праява вызначанага зьявішча, якое характэрна для сучаснага становішча шмат якіх падросткаў-вучняў.

Паглядзіце ў справы групкому скурнікаў прыватных прадпрыемстваў, справы, вырасшыя за апошнія некалькі год. Вы ўбачыце тут яскравы малюнак наступленьня гаспадарчыкаў на рабочую моладзь, наступленьне, якое выказваецца ў дзесятках дробязяй, няпачных на першы погляд. Гэта прымушае нас шмат аб чым падумаць.

Яшчэ аб справе **Сагаловіча**. Аб ёй яшчэ ня ведае комсамольская ячэйка. У групкоме нам сказалі:


— **«Ня было пасяджэньня бюро**

— **Не разьбіралі пытаньня.**

**Сорамна, што ў такім пытаньні, дзе комсамол павінен быў праявіць сваю ініцыятыву, яе якраз і ня было.**

Ячэйка, экономкамісія ня бачаць, як амаль што такія-ж самыя справы і выпадкі бываюць з іншымі вучнямі, працуючымі ў саматужнікаў.

**Ал. Каліта.**



Копия с копии

Пом прокурору по трудовым делам

Настоящим групком рабочих частных предприятий … производства г Минска препровождает копию заявле… …човича об избиении его гр-ном МИКУЛЯНЦЕМ при чем это имеет неоднократные случаи … такого рода явления у условиях недопустимым и крайне опасным в … дело в самом срочном порядке.

Пр. групкома /подпись/

Секретарь

Справа перададзена ў суд

# ЗА СЬПІНОЮ САЮЗУ

«Гаспадарчыкі» ўзьняліся.

Вось факты іх наступленьня.

### „Па сямейнаму“...

Ня так даўно саматужнік **Гурвіч** выгнаў, самым саўпраўдным чынам, прадстаўнікоў групкому скурнікаў прыватных прадпрыемстваў. Яны прышлі праверыць становішча падросткаў. Было вядома, што **вучні Гурвіча працуюць да позьняй ночы, пачынаючы ад самага раньня.**

Чаму не зацікавілася гэтым ячэйка пры групкоме? Ёсьць-жа некаторыя комсамольцы, якія ведаюць аб такіх фактах і нават самі працуюць звыш устаноўленага часу.

Ёсьць хлапцы сьвядомыя, дарослыя... Але іх бацькі, паміма групкому, заключаюць з саматужнікам гэтак званыя «сямейныя дагавары».

«Сямейны дагавор“—гэта кабала падростку. Заключыўшы яго, саматужнік, для афіцыйнасьці, каб усё вышла гладка, прыходзіць ў профком з просьбай заключыць ўжо законны дагавор. Дагавор падпісваецца.

Але па самай справе хлапец, **замест 6, працуе 8-9 гадзін,** часта нават ня гледзячы на гадзіньнік (уласна кажучы, і глядзець няма на што, бо такія рэчы ў майстэрнях чамусьці адсутнічаюць), атрымоўвае зарплату па ніжэйшаму разраду... Напрыклад, **дагавор заключаецца на 4 разрад, а хлапец атрымоўвае па 3-м ...**

Такія факты надзвычайна цяжка выкрыць. Ад саматужніка, вядома, нічога не даб'ешся, ад хлапца таксама — ён баіцца, што яго паб'юць і пазбавяць працы.

### Справа цягнецца паўгода...

Як не абурыцца судовым працэсам комсамольца **Зысмана, які цягнецца ўжо 6 месяцаў?** На працягу гэтага часу Зысман прымушан быў галадаць. Чым магла, яму аказвала падтрыманьне каса ўзаемадапамогі.

Ёсьць у нас 132 артыкул крымінальнага кодэксу, дзе ясна і проста гаворыцца: **саматужнік зволіўшы вучня, які набыў адну трэцюю частку сваёй кваліфікацыі, прыцягваецца да адказнасьці.**

Проста і ясна. А вось **Зысмана зволілі з працы.** Суд прызнаў гэтае звальненьне **няправільным.** Саматужнік **Вінік** надаў заяву ў прокуратуру, а там справа марудзіцца ўжо 6 месяцаў.

Групком і комсамольская ячэйка павінны зрабіць усё магчымае, каб такія справы не залежваліся ў вышэйшых інстанцыях. Бо дзякуючы гэтаму, беспрацоўныя вучні вымушаны заключаць кабальныя дагаворы і дабраахвотнаісьці на цяжкія эксплёататарскія ўмовы.

### Сэкрэт Брохіса.

Менск ведае, што лепшы абутак, што самыя бліскучыя «джымі»—навінкі Заходняй Эўропы, апошні «піск» моды—можна здабыць у магазыне Зыгманскага, што працуе па Ленінскай вуліцы пад фірмай: **б. Брохіс.** Толькі ў яго.

Брохіс ня мае майстэрні. Так ён заяўляе фінінспэктару — і ні групком і ніхто іншы ня можа знайсьці яго майстэрню.

**А да нас данесьліся чуткі, што вучні і рабочыя майстэрняў Брохіса абвесьцілі забастоўку, што эксплёатацыя там прымае жудасныя разьмеры.**

**Майстэрні гэтыя раскіданы па вёсках, працуюць у іх кваліфікаваныя майстры і вучні.**

І ўсё-ж такі мы нічога ня можам зрабіць. Ніводзін з рабочых Брохіса. калі была забастоўка, не заявіў аб гэтым у саюз, ніводзін з іх не зьяўляецца яго сябрам.

* * *

Цяпер, калі праводзіцца кампанія перазаключэньня колдагавораў, «гаспадарчыкі» асабліва ўзьнялі галавы.

Мы завастраем на гэтым грамадзкую ўвагу.

**«Старыя часы» для эксплёататараў ніколі ня вернуцца!**



## Гэта папярэдзіць хваробу.

### На адчыненьні дзіцячага саду для бяздольных дзяцей.

Аб усім значэньні новага дзіцячага саду для бяздольных дзяцей добра сказала матка аднаго з будучых пітомцаў—**т. Віцюк**:

— Мы ня маем магчымасьці працаваць, калі дома маленькія дзеці. Працуеш, а сэрца так і хвалюецца—«што дома з дзіцём?» Дзякую Савецкай уладзе за тое, што яна клапоціцца аб нашых дзецях... Цяпер я спакойна буду працаваць.

І да гэтага яшчэ дадалі т. т. **Будзін і Таубэ:**

— **Організацыяй дзіцячых садоў мы зможам папярэджваць хваробу бяспрытульнасьці ў самым яе зародку.**

За астатняе сказалі лічбы і факты:

— Дзіцячы сад на Суражскай, 13, адчынены таварыствам „Прыхільнік дзяцей“, будзе абслугоўваць 40 маленькіх дзяцей ва ўзросьце ад 2 да 4 год. Маткі гэтых дзяцей змогуцьісьці працаваць. Дзецям будзе давацца полудзень, з імі будуць праводзіцца гульні, чытка апавяданьняў і шмат іншага.

Паступова лік абслугоўваемых садам дзяцей будзе даведзены да 60 асоб. **А—кі**



### Сэсія ЦВК.

Чарговая сэсія ЦВК БССР склікаецца ў Менску, у другой палове сьнежня 1927 г.

На парадку дню сэсіі наступныя пытаньні: 1) Бюджэт БССР на 1927-28 год, 2) становішча народнай гаспадаркі БССР, 3) аб сыстэме народнай асьветы, 4) рацыяналізацыя савецкага апарату, 5) Зьмены ў складзе ўраду і 6) зацьверджаньне законаў ураду, прынятых у пэрыод паміж першай і другой сэсіямі.

### Маніфэст ажыцьцяўляецца.

У выкананьне Кастрычнікавага маніфэсту прэзыдыум ЦВК БССР прыняў пастанову аб прадастаўленьні працоўным Беларусі цэлага шэрагу фінансавых і падаткавых ільгот.

Даручана Наркамфіну вызваліць бяднейшыя сялянскія гаспадаркі ад сельгаспадатку з такім разьлікам, каб пад гэтую ільготу падпала ня менш 35 проц. гаспадарак.

3 лістапада гэтага году зьнімаюцца ўсе нядоімкі, штрафы і пені на суму да 100 р., якія лічацца за рабочымі і служачымі ня маючымі акрамя зарплаты, іншых даходаў.

### Земляўпарадкаваньне на дзяржаўны кошт.

Прэзыдыум ЦВК БССР, на сваім апошнім пасяджэньні, пастанавіў прыняць на дзяржаўны кошт земляўпарадкаваньне ўсіх незаможных сялянскіх гаспадарак.

Згодна гэтай пастановы, у хуткім часе Наркамзем прыступіць да разьмеркаваньня запаснога зямельнага фонду БССР сярод сялянскай беднаты.

## На фронце асьветы.

### Бібліотэчкі для малапісьменных.

Цэнтральны савет таварыства „Прэч няпісьменнасьць“ прыступіў да выданьня бібліотэчкі для малапісьменных, скончыўшых лікпункты. У бібліотэчку ўвойдуць кніжкі па савецкім будаўніцтве, політычных пытаньнях і творы мастацкай літаратуры.

Бібліотэчка выйдзе з друку да пачатку 1928 году.

### 23000 чалавек у вячэрніх школах.

У бягучым годзе на тэрыторыі БССР існуе 27 школ павышанага тыпу, 22 школы рабочай моладзі і 300 вячэрніх ШСМ.

Ва ўсіх гэтых школах вучыцца каля 23 тысяч чалавек, галоўным чынам моладзь.

### За ліквідацыяй няпісьменнасьці.

Па БССР сёлета працуюць **1002 лікпункты**, з якіх частка існуе на дзяржаўныя сродкі, частка ўтрымліваецца профэсыйнымі і грамадзкімі організацыямі.


У леташнім годзе колькасьць лікпунктаў у БССР дасягала толькі 872.

Да сучаснага моманту ў нашай краіне на кожную тысячу насельніцтва прыходзіцца 590 няпісьменных (у вогуле каля 3 мільёнаў няпісьменных).

### Усё больш школ.

У 1927-28 годзе значна ўзрос лік навучальных установаў па БССР.

Мы зараз маем 4900 чатырохгодак, 294 сямігодак, 40 тэхнікумаў па розных галінах спэцыяльнасьцяў, нарэшце 45 профшкол і школ ФЗВ.





### „Кацярына Ізмайлава“.

(Кіно «Чырвоная Зорка»).

Маленькі купецкі гарадок 90-х гадоў мінулага сталецьця... Закаранелы, гнілы быт. Гадзенькія людзі. Адвечная пагоня за багацтвам—усёроўна, якім шляхам яно-бы ні даставалася. Забойствы, эксплёатацыя ніжэй стаячых, злачынствы і лёзунг „мэта апраўдвае сродкі“.

Гэта тэма „**Кацярыны Ізмайлавай**». Фільм зроблены па аповесьці Ляскова „**Леди Макбет Мценского уезда**“. Трэба сказаць, што тое, аб чым апавядае Ляскоў у сваім творы, дакладна і таленавіта перададзена на экран.

Мэта фільму—паказаць гніль купецкага быту 90 гадоў.

Гэта дасягаецца высока-мастацкім рэалізмам і гістарычнай праўдзівасьцю пастаноўкі. У кожнай дробязі, у кожным дробным факце праслізгвае брыдкі твар купецкага жыцьця. Падаецца ўсё гэта на фоне барацьбы за багацтва.

Характэрныя тыпы фільму гадзенькі прыказчык Сяргей, слабавольны купец Зіновей, сумуючая па каханьню купчыха Кацярына і старык—бацька,—усе гэтыя тыпы падаюцца артыстымі вельмі жыцьцёва, вельмі натуральна.

Да гэтага яшчэ дадаюцца бытавыя моманты з жыцьця самаго гарадка (масьляніца, гулянкі, вясельле і інш.). Яны ўзмацняюць агульную ўстаноўку фільму.

Заслуга „Кацярыны Ізмайлавай“ — сьвежасьць тэмы, яе самабытная і натуральная апрацоўка.

М. Т—э.

## № 12. Шахматы і шашкі № 12.

(Друкуецца па суботах).

### Задача № 15.

**П. Ліпкінда (Менск).**



Белыя: Крg5, Сh5, Сc3. Кd4, Кe4... (5).
Чорныя: Крc4, пп: d6, d3... (3)

**Мат у 3 хады.**

### Эцюд № 7 (шашачны)

**І. Левіна (Барысаў).**

Белыя: пп:b4, c3, d4, e1, h4, b6... (6)
Чорныя: D—b8, d8, пп:b6, f4, b8... (5)

**Нічыя.**

### ХРОНІКА.

**Менск.** У нядзелю 13 лістапада, а 7-ай гадзіне ўвечары, у Менскім вучнёўскім шахклюбу адбыўся шахматна-шашачны вечар. Сэанс адначасовай гульні, у якім прымалі ўдзел 31 ч. даў **Блюмбэрг**—адзін з лепшых шахматыстых Менску, удзельнік беларускай каманды на камандных спаборніцтвах СССР. Акрамя сэансу былі праведзены два „молниеносных“ турніра па шашках. У турніру І і ІІ катэгорый пераможнікам зьявіўся **Берман**, 2-е места заняў Трэстман. У турніру ІІІ і IV катэгоры пераможнікам зьявіўся **Гардон С.**, выйграўшы ўсе 9 партый турніру.

**Кейлес С. і Рапапорт І.** падзялілі ІІ і ІІІ месцы.

На новым скурзаводзе організаваўся шахматны гурток пад кіраўніцтвам т. **Кейлеса.**

### Правільна рашылі.

Правільнае рашэньне эцюду № 6 **Р. Пайкіна** прыслалі: **Гардон Г., Зысман А., Розенблюм І., Сьлепян Б. і Розенблюм С.**

### Папраўка.

У задачы № 14 **Зысмана А.** Лh5 павінна быць на d5, а Кe6 на e7.

У нядзелю, 20-га лістапада, у клюбе саўгандлслужачых адбудзецца сход шахматыстых і шашыстых клюбу. Тав. **Касьперскі** зробіць даклад аб выніках 5-га шахматна-шашачнага зьезду СССР. Пасьля дакладу, Касьперскі дасьць сэанс аднач асовай гульні ў шахматы для неабмежаванага ліку шахматыстых.

Кожны, жадаючы прыняць удзел у сэансе, павінен прынесьці гульню.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867.

Менск, друкарня БДВ